# § 6. Дзейнасная сутнасць чалавека




**Структура дзейнасці.** Чалавек можа паўнавартасна існаваць толькі ў цеснай сувязі з навакольным асяроддзем — прыродным і сацыяльным. Як біялагічны арганізм чалавек (падобна да іншых істот) мае патрэбу ў ежы, сне, адпачынку; як асоба чалавек не можа сфарміравацца і існаваць па-за грамадствам, без зносін і ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі. На задавальненне гэтых патрэб як умовы існавання чалавека накіравана яго дзейнасць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Дзейнасць** — уласцівае чалавеку актыўнае стаўленне да разнастайных умоў свайго жыцця і да самога сябе, іх усвядомленае пераўтварэнне ў адпаведнасці са сваімі жаданнямі. Разнастайнасць дзейнасці вызначае розныя падыходы да яе структуры, вылучэння асобных элементаў. Напрыклад, дзейнасць можна разглядаць як:

- паслядоўнасць дзеянняў, што змяняюць адно другое, для дасягнення пастаўленай мэты;
- змяненне матываў, што накіроўваюць дзеянні чалавека.

Структура дзейнасці ўключае матывы і дзеянні для дасягнення мэты (канкрэтных мэт), якія з'яўляюцца своеасаблівымі прыступкамі на шляху рэалізацыі матываў, а таксама сродкі іх дасягнення і канчатковы вынік.

**Структура дзейнасці**

Матыў → Мэта → Сродкі → Дзеянні → Вынік

Суаднясіце пытанні з элементамі схемы «Структура дзейнасці»:

- Дзеля чаго?
- Чаму?
- Як?
- З дапамогай чаго?
- Што ў выніку?

Індывідуальна і сумесна з іншымі людзьмі мы здзяйсняем мноства розных дзеянняў (напрыклад, у гэты момант вы чытаеце дадзены тэкст). Аднак далёка не ўсе з іх можна назваць учынкамі. *Учынак* — гэта асобасна значны, самастойны і закончаны акт дзейнасці. Па ўчынку можна меркаваць пра асобу, бо ён вызначаецца каштоўнаснымі арыенцірамі чалавека і заўсёды здзяйсняецца як выбар.

**Патрэбы і матывы чалавека.** Пры тлумачэнні вытокаў чалавечай дзейнасці часцей за ўсё выкарыстоўваюцца паняцці «патрэба» і «матыў». **Патрэба** — гэта стан нястачы, недахопу чаго-небудзь, не-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

абходнага асобнаму чалавеку, групе людзей або грамадству ў цэлым. Патрэбы бываюць розныя: матэрыяльныя і духоўныя, прыроджаныя і набытыя, пастаянныя і сітуатыўныя. Яны не заўсёды выразна ўсведамляюцца чалавекам. А калі яны ўсвядомлены чалавекам і падахвочваюць яго да дзеяння, можна казаць пра матывы. **Матыў** (франц. *motif* — матыў, ад лац. *movēre* — рухаць) — гэта заахвочванне да ўсвядомленых актыўных дзеянняў, аснову якіх складае эмацыйна перажытае жаданне нечага дасягнуць, нешта здзейсніць у жыцці. Тэрмін «матыў» прынята ўжываць у сітуацыях, калі гаворка ідзе пра такія найбольш значныя ў жыцці чалавека з'явы, як навучанне, праца, здароўе, сям'я, ідэйныя перакананні, вера, адносіны з людзьмі і стаўленне да краіны, у якой нарадзіўся і жывеш і інш.



**Чаму важна разумець матывы людзей?**

Тры чалавекі працавалі на будоўлі. У аднаго з іх спыталі:

— Што ты тут робіш?

Спыніўшыся і выцершы пот, ён стомлена адказаў:

— Я кладу цэглу.

Тое самае пытанне задалі другому. Ён адказаў:

— Я зарабляю грошы. У мяне вялікая сям'я, і я павінен яе карміць.

Трэці чалавек, пачуўшы такое самае пытанне, адказаў:

— Я будую храм!

Абмяркуйце ў парах. Прывядзіце прыклады аднолькавых дзеянняў, у якіх могуць быць супрацьлеглыя матывы. Прывядзіце прыклады розных учынкаў, у аснове якіх могуць быць аднолькавыя матывы. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У ліку найбольш важных для чалавека матываў часта кажуць пра матыў *самаактуалізацыі*, іншымі словамі — пра імкненне чалавека стаць такім, якім ён можа быць, максімальна развіць і рэалізаваць свае здольнасці, дасягнуць найбольшых поспехаў у прафесійнай дзейнасці і асабістым жыцці. У імкненні да самаактуалізацыі часцей за ўсё бачаць крыніцу пазнання навакольнага свету, а таксама творчасці, пад якой разумеюць стварэнне новых, арыгінальных, значных ідэй і прадметаў у розных галінах жыцця людзей, але перш за ўсё ў навуцы, тэхніцы і мастацтве.

Самаактуалізацыя з'яўляецца вяршыняй у «пірамідзе патрэб», распрацаванай амерыканскім вучоным Абрахамам Маслоу ў сярэдзіне XX ст. ■

Маслоу вылучыў групы патрэб і матываў, якія ўпарадкаваў адпаведна іх значнасці ў жыцці і развіцці чалавека. Іерархія пачынаецца з неабходнасці першапачатковага задавальнення фізіялагічных патрэб людзей (дыхаць, піць, есці, саграваецца). За задавальненнем фізіялагічных патрэб наступным па значнасці ў іерархіі Маслоу знаходзіцца імкненне да фізічнай бяспекі і абароненасці. Трэцяе і чацвёртае месцы займае імкненне да сацыяльных сувязяў, інакш кажучы, сяброўскіх адносін з людзьмі, і да грамадскай павагі і прызнання. На вяршыні іерархіі знаходзіцца самаактуалізацыя. Перш чым актывуюцца жаданні больш высокіх узроўняў, павінны быць задаволены патрэбы ніжэйшых узроўняў.

Ці абавязкова блакіруюцца іншыя чалавечыя імкненні, у тым ліку і матыў самаактуалізацыі, калі ніжэйшыя патрэбы часова не задаволены? Выкарыстоўвайце пры адказе ўводную інфаграфіку. ■

З паняццямі «матыў» і «патрэбы» суадносіцца паняцце «інтарэс». *Інтарэс* — гэта станоўча афарбаваны эмацыйны працэс, звязаны з патрэбай даведацца нешта новае пра пэўны аб'ект, з па-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вышанай увагай да яго. У інтарэсе таксама выяўляецца імкненне чалавека да спрыяльных умоў сваёй дзейнасці.

Сучасны чалавек жыве ў надзвычай насычаным інфармацыяй асяроддзі — медыясферы, у якой маладыя людзі праводзяць значна больш часу, чым прадстаўнікі старэйшых пакаленняў. Гэта адлюстравана ў гумарыстычнай інтэрпрэтацыі «Пірамiды патрэб» Маслоу на ўводнай інфаграфіцы, дзе дамаляваны яе падмурак. Як сфарміраваліся інфармацыйныя патрэбы сучаснага чалавека? Наколькі мы іх усведамляем? Ці ўваходзяць медыя ў кола нашых інтарэсаў або яны ўжо ператварыліся ў сапраўднае захапленне?

**Колькі часу мы штодзень прысвячаем медыясферы?**

**Кнігі**
- Навучальныя дапаможнікі
- Літаратура па вучэбнай праграме
- Літаратура на асабісты выбар

**Радыё**
- Навіны
- Музыка
- Падкасты па тэмах

**Прэса** (газеты і часопісы)
- Навіны
- Аналітыка
- Калонкі пра знакамітасцей

**Тэлебачанне**
- Навіны
- Кіно
- Шоу
- Адукацыйныя праграмы

**Інтэрнэт**
- Пошук інфармацыі, навін
- Кіно, аўдыя, відэа
- Гульні
- Сацыяльныя сеткі
- Навучанне
- Праца

Складзіце дыяграму «Мой дзень у медыясферы» (будны або выхадны). Адлюструйце ў ёй, як размеркаваны ваш час. Як вы думаеце, ці рацыянальна вы выдаткоўваеце свой час? Параўнайце з дыяграмамі аднакласнікаў, абмяркуйце вынікі. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Віды дзейнасці.** З патрэбамі звязана ўзнікненне розных відаў дзейнасці. Неабходнасць рэалізацыі біялагічных патрэб спарадзіла практычную, перш за ўсё працоўную дзейнасць чалавека. Для яе ажыццяўлення патрэбны веды пра навакольны свет і самога чалавека, развіццё яго здольнасцей і працоўных навыкаў, стварэнне прылад працы. Рэалізацыя патрэбы ў пазнанні навакольнага свету і свайго месца ў ім спарадзіла пазнавальную дзейнасць, перш за ўсё навуковыя веды, мастацтва, маральныя, рэлігійныя, філасофскія і палітычныя ідэі. Вялікая роля ў навучанні чалавека працоўным навыкам, прывіцці нормаў сумеснага жыцця, набыцці першапачатковых ведаў пра свет і сябе з даўніх гістарычных часоў належыць гульнёвай дзейнасці.

Пералічыце вядомыя вам гульні. Прапануйце некалькі крытэрыяў, паводле якіх можна вылучыць розныя віды гульняў. ■

Гульня вызначаецца як свабоднае дзеянне, якім займаюцца без прымусу, у вольны час. Гэтыя дзеянні робяць у адмысловай гульнёвай прасторы, таму гульня адрозніваецца ад рэальнага жыцця. Разам з тым у гульні ёсць пэўны парадак, правілы, якія неабходна выконваць.

Калі гуляе дзіця, яно асвойвае навакольны свет. У жыцці дарослых людзей гульнёвы падыход эфектыўны ў працэсе навучання, паколькі гульня актывізуе эмоцыі. Падчас гульні людзьмі рухае жаданне перамагчы, нестандартна выявіць сябе, ужыць арыгінальную ідэю. У чалавека з'яўляецца глыбінная патрэба адшукаць спосаб вырашэння праблемы або задачы. Такі від дзейнасці можа выкарыстоўвацца ў дачыненні да любой сферы.

**Як узаемазвязаны розныя віды дзейнасці?**

**Дзейнасць**

**Гульня** | **Навучанне** | **Праца**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Якім чынам адна і тая дзейнасць чалавека можа быць працай для аднаго і гульнёй для другога? Прывядзіце прыклады гульні ў навучальнай дзейнасці. ■

У кожным відзе дзейнасці ставяцца пэўныя мэты і задачы і выкарыстоўваюцца адпаведныя сродкі для іх дасягнення. Паводле характару самога працэсу дзейнасці яе можна падзяліць на рэпрадуктыўную і творчую.

Для рэпрадуктыўнай дзейнасці характэрна паўтарэнне раней ужо адпрацаваных сродкаў дасягнення загадзя вядомага выніку. Напрыклад, вырабіць сто аднолькавых дэталяў за змену ці дзесяць разоў сыграць адну і тую гаму. Прыметамі рэпрадуктыўнай дзейнасці з'яўляюцца тыповыя, стандартныя, правераныя, неаднаразова паўтораныя ў мінулым дзеянні.

Да творчай належаць толькі тыя віды дзейнасці, у працэсе выканання якіх чалавек стварае новае для сябе і (або) іншых людзей. Гэта можа быць новая мэта і, адпаведна, новы вынік ці новыя сродкі, новыя спосабы іх дасягнення. Найбольш ярка творчасць выяўляецца ў дзейнасці навукоўцаў, вынаходнікаў, пісьменнікаў, мастакоў, якіх часта называюць прадстаўнікамі творчых прафесій. На самай справе многія іншыя віды дзейнасці таксама ўключаюць у сябе элементы творчасці.

Напрыканцы неабходна адзначыць, што падставай для любой дзейнасці чалавека з'яўляюцца зносіны. Без зносін чалавечая дзейнасць немагчымая, таму менавіта зносіны будуць прадметам нашай увагі ў наступных параграфах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Што такое матывы і патрэбы чалавека?
2. Вылучыце структурныя кампаненты дзейнасці (матыў, мэта, дзеянні і сродкі) у наступных сітуацыях:
   - каб парадаваць і здзівіць сваіх гасцей, гаспадыня вывучае кулінарныя кнігі і сайты ў пошуках «экзатычных» рэцэптаў;
   - збіраючыся ў падарожжа, аўтааматар правярае стан свайго аўтамабіля, залівае поўны бак паліва, мяняе масла;
   - многія выпускнікі школ імкнуцца вучыцца ў вышэйшых навучальных установах і атрымаць прафесію высокай кваліфікацыі. Маладыя людзі загадзя выбіраюць будучую спецыяльнасць і адпаведную ёй навучальную ўстанову, рыхтуюцца да паступлення, магчымага пераезду на новае месца жыхарства. Для рэалізацыі свайго імкнення маладыя людзі выкарыстоўваюць паглыбленае вывучэнне адпаведных вучэбных прадметаў, наведванне факультатыўных заняткаў, удзел у прадметных алімпіядах і інш.
3. Дакажыце або аспрэчце наступныя меркаванні. Выкарыстоўвайце ўводную інфаграфіку.
   - Да базавых патрэб чалавека адносяцца сон, ежа, прызнанне, бяспека.
   - Фундаментам «піраміды патрэб» з'яўляецца самаактуалізацыя.
4. Станоўчая матывацыя — гэта матывацыя, заснаваная на станоўчых стымулах (заахвочваць да нечага). Адмоўная матывацыя — гэта матывацыя, заснаваная на адмоўных стымулах (караць за нешта). Якая матывацыя, на ваш погляд, больш эфектыўная? Чаму?

Выканайце міні-праект «Патрэбы і рэклама». Стварыце калаж або плакат, прысвечаны спосабам уздзеяння рэкламы на патрэбы і матывацыю падлеткаў. Выкарыстоўвайце памятку «Як аналізаваць рэкламны ролік?».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне